# Фарміраванне маўленчай культуры вучняў III класа ў працэсе асваення метапрадметных вынікаў навучання беларускай мове

Дапрацоўка вучэбных праграм па беларускай мове на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі звязана з рэалізацыяй кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні, які прадугледжвае не толькі фарміраванне ў навучэнцаў пэўных ведаў аб мове, але і развіццё ў іх уменняў аналізаваць і сістэматызаваць моўную інфармацыю, прымяняць яе ў маўленчай дзейнасці згодна з асобаснымі запатрабаваннямі для рашэння вучэбных, пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач. У сувязі з гэтым працэс вывучэння беларускай мовы павінен быць накіраваны на авалоданне дзецьмі асобаснымі, метапрадметнымі і прадметнымі вынікамі навучання.

Метапрадметныя вынікі — гэта асвоеныя вучнямі спосабы дзейнасці, якія могуць прымяняцца як у межах адукацыйнага працэсу, так і пры рашэнні праблем у рэальных жыццёвых сітуацыях.

На ўроках беларускай мовы ў I—IV класах настаўніку варта вучыць дзяцей:

- успрымаць і асэнсоўваць вучэбны матэрыял, які прад'яўляецца ў вербальнай форме, вылучаць у ім галоўнае, рацыянальна запамінаць новыя звесткі, выконваць разумовыя аперацыі (параўнанне, аналіз, сінтэз);
- выкарыстоўваць маўленчыя сродкі і сродкі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для рашэння камунікатыўных і пазнаваўчых задач;
- працаваць з вучэбнай кнігай, іншымі друкаванымі і аўдыёвізуальнымі крыніцамі інфармацыі;
- праводзіць пошук неабходнай інфармацыі, правільна яе прымяняць і захоўваць, рыхтаваць на яе падставе сваё выступленне і выступаць з аўдыё-, відэа- і графічным суправаджэннем;
- слухаць суразмоўцу і весці дыялог, прызнаваць наяўнасць розных пунктаў погляду, аргументавана выказваць сваё меркаванне.

**Дыдактычныя матэрыялы**, распрацаваныя для III класа, ставяць на мэце выпрацоўку метапрадметных вынікаў навучання і накіраваны на фарміраванне моўнай, маўленча-камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый вучняў. Практычны матэрыял ахоплівае раздзелы “Тэкст”, “Сказ”, “Значэнне слова”, “Склад слова”, “Часціны мовы”.

Змястоўная частка заданняў падабрана з улікам прынцыпаў навуковасці, даступнасці, актывізацыі рэфлексіўных дзеянняў, забеспячэння інтэлектуальнага, эстэтычнага і індывідуальнага развіцця навучэнцаў і садзейнічае выпрацоўцы ў трэцякласнікаў:

**1) навыкаў асэнсаванага чытання тэкстаў**

Прачытайце тэкст.

**Падрыхтоўка да зімы**

Старанна рыхтуецца да зімы барсук. Ён замяняе ў нары падсцілку. Звер дабаўляе да лісця сцяблінкі рамонкаў і галінкі чаромхі. Яны выганяюць надакучлівых насякомых і шкодных мікробаў. Барсук ведае сакрэт моцнага зімовага сну.

*Паводле Я. Галубовіча.*

а) Выберыце правільнае сцвярджэнне.

Загаловак тэксту ўказвае на:

☐ тэму

☐ асноўную думку

б) Падкрэсліце сказ, у якім выражаецца асноўная думка тэксту.

**2) навыкаў валодання лагічнымі дзеяннямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі**

У кожнай групе сказаў знайдзіце “лішні” сказ і выпішыце яго. Растлумачце свой выбар.

1. Сыраежкі лічацца модніцамі сярод грыбоў. Бабуля, давай пойдзем у лес. Дзядуля, навучы мяне збіраць грыбы.

2. Ці бачылі вы падасінавікі? Кожны грыбок мае адметную вопратку. Дзе растуць лісічкі?

3. Колькі грыбоў у лесе! Мы назбіралі поўныя кошыкі! Капялюшыкі пафарбаваны ў розныя колеры і адценні.

Прачытайце выпісаныя сказы. Што яны ўтвараюць? Падбярыце да тэксту загаловак.

**3) уменняў прымаць і захоўваць мэты і задачы вучэбнай дзейнасці**

Прачытайце прыказкі. Пазнаёмцеся са словамі для даведкі. Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго.

**Увосень** плача, хто ________ скача.
На **чорным** полі ________ пшаніца родзіць.
**Летнюю** часіну ________ тыднем не заменіш.
*Словы для даведкі:* белая, увесну, зімовым.

**4) уменняў кантраляваць свае вучэбныя дзеянні**

Прачытайце скарагаворкі. Разгледзьце схемы да іх.

а) Летам Тамара гербарый сабрала *(М. Пазнякоў)*.

б) Шуміць ля ракі чарот шапаткі *(М. Пазнякоў)*.

в) Лоўка за вяроўку трымаў цацку Воўка *(У. Мацвеенка)*.




Схема якога сказа адлюстравана няправільна? Запішыце гэты сказ. Самастойна пабудуйце яго схему.

**5) уменняў працаваць з мадэлямі і схемамі**

Разгледзьце схемы саставу слова. Пад кожнай схемай запішыце словы, якія ёй адпавядаюць.

Узлесак, лясны, лес; мора, заморскі, марскі; смешны, смех, насмешка; вада, падводны, вадзіца.

Дапоўніце кожны слупок слоў двума сваімі прыкладамі.



**6) уменняў шукаць інфармацыю рознымі спосабамі**

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка. Злучыце малюнкі з тымі словамі, якія не былі выкарыстаны ў сказах.

| | |
|---|---|
| а) Выраб з варсістай тканіны, які кладзецца на падлогу, — гэта... | люстра |
| б) Мяккая мэбля са спінкай і падлакотнікамі — гэта... | лямпа |
| в) Гладкая бліскучая паверхня, здольная даваць адбіткі тых прадметаў, якія знаходзяцца перад ёй, — гэта... | дыван |
| г) Жаданне, імкненне — гэта... | канапа |
| | ахвота |
| | паляванне |




Да якога слоўніка трэба звярнуцца пры ўзнікненні цяжкасцей падчас выканання задання? Абвядзіце літару (або літары) з правільным адказам.

а) Да тлумачальнага;
б) да арфаграфічнага;
в) да беларуска-рускага;
г) да руска-беларускага.

**7) уменняў выконваць заданні творчага і пошукавага характару**

Адзначце зверху, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы.

У таты была бліскучая **піла**. Таня **піла** чай з прыгожага кубачка.

Тонкія **вусны** рабілі твар настаўніцы крыху строгім. На ўроку дзеці рабілі **вусны** пераказ тэксту.

**8) уменняў будаваць разважанні**

Выберыце правільнае сцвярджэнне і запішыце ход сваіх разважанняў.

У спалучэннях слоў **сін.. кветка** і **сін.. неба** прыметнік

☐ мае розныя канчаткі, паколькі ________________;

☐ мае аднолькавыя канчаткі, паколькі ________________.

Дыдактычныя матэрыялы могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні адпаведных тэм на ўро-

ках беларускай мовы, а таксама на стымулюючых і падтрымліваючых занятках. Можна арганізоўваць франтальную і індывідуальную працу.

На дыску прапанаваны **дыягнастычныя матэрыялы**, якія ставяць на мэце вызначэнне ступені сфарміраванасці ў навучэнцаў III класа метапрадметных вынікаў навучання па тэмах “Тэкст”, “Сказ”, “Значэнне слова”, “Склад слова”, “Часціны мовы”. Яны ўяўляюць сабой кантрольныя работы. Кожная работа складаецца з пяці заданняў. Дыягнастычныя кантрольныя работы можна праводзіць у канцы вывучэння кожнага раздзела. На іх выкананне адводзіцца 15—20 хвілін урока.

Настаўніку неабходна загадзя падрыхтаваць індывідуальныя аркушы з заданнямі па колькасці вучняў у класе. Дзеці чытаюць заданне, асэнсоўваюць яго, фармулююць адказ. Пры неабходнасці настаўнік дае тлумачэнні тым вучням, у якіх узнікаюць цяжкасці пры ўсведамленні задання.

Асаблівасцю правядзення дыягнастычных работ з’яўляецца поўная самастойнасць навучэнцаў як адзін з важных сродкаў развіцця асобы, засваення вучэбнага матэрыялу, замацавання і праверкі ведаў.

Ацэньваючы выкананне вучнямі заданняў кантрольнай работы па кожным раздзеле, настаўнік звяртае ўвагу на дынаміку развіцця адпаведных метапрадметных уменняў.

## Дыдактычныя матэрыялы па прадмеце “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” (III клас)

### ТЭКСТ

### Практыкаванні, накіраваныя на авалоданне навыкамі асэнсаванага чытання тэкстаў

**1.** Прачытайце тэкст.

**Паратунак**

По камлі яблыні апускалася божая кароўка. Вусікі ў кароўкі кароткія. Сама чырвоная, як пераспелая сунічка, а на крыльцах — пяць кропачак...

Куды ж яна паўзе?

А тая апусцілася па камлі амаль долу і схавалася ў трэшчынцы пад карою.

Стаў на калені і — ажно замёр ад здзіўлення: трэшчынка да самых краёў была набіта кароўкамі! “Дык гэта ж яны ад зімы пахаваліся!” — узрадаваўся я, пайшоў да сціртьі і прынёс да яблыні добры ахапак саломы. Шчыльна абклаў камель і прыціснуў суччам.

Вечарам прайшоў халодны дождж са снегам, але за божых каровак я не баяўся.

*Паводле Я. Галубовіча.*

а) Прачытайце сказы. Адзначце той сказ, у якім сфармулявана асноўная думка тэксту.

☐ Божыя кароўкі надзейна ўкрытыя ад марозу, за іх можна не хвалявацца.

☐ Зімой божыя кароўкі хаваюцца ад марозу ў розныя шчылінкі.

б) Падзяліце тэкст на часткі згодна з планам.

*План*

1. “Куды ж яна паўзе?”
2. “Дык гэта ж яны ад зімы пахаваліся!”
3. “За божых каровак я не баяўся”.

Пастаўце ў тэксце крыжык у пачатку кожнай часткі.

**2.** Прачытайце тэкст.

**Флейта**

Ужо трэцюю раніцу Ліна прачыналася ад лагодных гукаў. І гэта не клапатлівы голас маці і не мурканне пяшчотнай коткі. Ужо трэцюю раніцу дзяўчынка прачыналася з першымі праменьчыкамі сонца. Яна быццам чула, як яно жартаўліва выглядвае з-за рэчкі. Адкуль жа гэтыя чароўныя гукі?

На балконе суседняга дома стаяла дзяўчына і прыціскала да вуснаў сярэбраную дудачку. Вось бы Ліне навучыцца так іграць!

Пазней дзяўчынка даведалася, што гэта флейта. Каб іграць на ёй, музыка прыціскае флейту да вуснаў і ўдзімае ў яе паветра.

*Паводле В. Прохаравай.*

а) Які музычны інструмент зачараваў Ліну? Абвядзіце яго назву ў тэксце.

б) Выразна прачытайце сказ, у якім перадаецца жаданне дзяўчынкі, і падкрэсліце яго.

в) Знайдзіце ў тэксце сказ, у якім заключаецца пытанне. Знайдзіце і прачытайце адказ на яго. Запішыце абодва сказы.

---

**3.** Прачытайце тэкст. Падрыхтуйцеся адказаць на пытанні да яго.

**Па арэхі**

☐ Сярэдзіна верасня. Вечарэе. Дзьме лёгкі вятрыска. З алешніку, які пачынаецца адразу за вёскаю, даносіцца гаркаваты пах прывялай травы і бульбоўніку. Бляшана шарахцяць лістотай каля возера дубы. Возера неспакойнае. На бераг коцяцца хвалі з белымі грабянямі. Над узлескам высока ляцяць жураўлі. Радуюся, што зіма яшчэ далёка, і збіраю каля возера ў ляшчынніку арэхі.

☐ Раптам убачыў у возеры дзвюх вавёрак. Выставіўшы з вады мордачкі і задраўшы ўверх, нібы сцяжкі, пушыстыя хвосцікі, яны плылі па вадзе ў бок ляшчынніку. “Па арэхі вавёркі плывуць ажно з процілеглага берага, з сасонніку, — здагадаўся я. — Не мне ж аднаму імі ласавацца”.

☐ Каб не спалохаць звяркоў, схаваўся за кустамі. А вавёркі выбраліся з вады дый на ляшчыну скокнулі.

*Я. Галубовіч.*

а) Запішыце, калі адбываюцца падзеі, апісаныя ў тэксце.

________________________________________

Падкрэсліце ў тэксце сказы, якія падказалі адказ на пытанне.

б) Адзначце тую частку тэксту, у якой змешчана апісанне незвычайных паводзін вавёрак.

в) Для чаго вавёркі вырашылі пераплысці возера?

________________________________________

г) Падкрэсліце сярод прапанаваных тыя словы і спалучэнні слоў, якімі можна ахарактарызаваць аўтара тэксту.

Назіральны, няўважлівы, клапатлівы ў адносінах да жывёл, здагадлівы, не любіць прыроду.

**4.** Прачытайце віншаванне вучня свайму сябру. Чаго не хапае ў ім?

Сябар!

Прымі мае віншаванні з днём нараджэння.

Сяргей.

Дапішыце патрэбныя словы.

____________ сябар!

Прымі мае віншаванні з днём нараджэння. Жадаю табе __________, __________, __________.

Няхай збудуцца ________________________________________.

Сяргей.

Адзначце паштоўкі, на якіх можна напісаць гэтае віншаванне.




## СКАЗ

### Практыкаванне, накіраванае на авалоданне лагічнымі дзеяннямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі

Выразна прачытайце пытальныя сказы. Падкрэсліце ў іх пытальныя словы.

а) Ці ведаеце вы палятуху?

б) Дзе вы бачылі палятуху?

в) Калі вы бачылі палятуху?

Якім з гэтых сказаў трэба дапоўніць наступны тэкст?

**Палятуха**

____________? Гэты звярок жыве ў глухіх лясах. Ён нагадвае вавёрачку. Толькі на канцах вушэй кутасікаў не мае. У час палёту звярок планіруе з дрэва на дрэва.

*Паводле Я. Галубовіча.*

Дапішыце патрэбны сказ. Падкрэсліце ў ім пытальнае слова.

### Практыкаванні, накіраваныя на авалоданне ўменнямі працаваць з мадэлямі і схемамі

**1.** Прачытайце скорагаворкі. Назавіце ў іх галоўныя члены сказа. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.

а) Платон за платанам плот ладзіў старанна *(С. Шах).*

б) Сёння я пасею градку сельдэрэю *(С. Шах).*

Запішыце той сказ, які адпавядае схеме.




**2.** Прачытайце сказы. Вусна вызначце ў іх сувязь слоў па пытаннях. Запішыце сказы ў той паслядоўнасці, у якой размешчаны схемы да іх.

Учора мы наведалі яе.

Выстава знаёміць наведвальнікаў з народнымі рамёствамі Беларусі.

У музеі адкрылася новая выстава.



## ЗНАЧЭННЕ СЛОВА

### Практыкаванне, накіраванае на авалоданне ўменнямі выконваць заданні творчага і пошукавага характару

Дапоўніце пары сказаў адным і тым жа словам. Карыстайцеся малюнкамі-падказкамі. Падкрэсліце сказы, у якіх запісаныя словы ўжываюцца ў пераносным значэнні.

Дождж ____________ .
Дзядуля ____________ .



Мама ____________ .
Сонейка ____________ .



Час ____________ .
Ракета ____________ .



Вада ____________ .
Работа ____________ .



### Практыкаванні, накіраваныя на авалоданне лагічнымі дзеяннямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі

**1.** Прачытайце радкі слоў. Вызначце прымету, па якой словы кожнага радка аб'яднаны ў пары. Падбярыце і дапішыце пару да кожнага выдзеленага слова.

а) Белы — чорны, зіма — лета, **цёмны** — ________, **восень** — ________.

б) Гоман — шум, загадкавы — таямнічы, **буйны** — ________, **шмат** — ________.

**2.** Патлумачце значэнне слоў. Назавіце прымету, якая аб'ядноўвае словы ў кожным радку. Дапоўніце кожны рад слоў. Выкарыстайце словы для даведкі.

Афіша, балерына, музыкант, гледачы, самалёт, падручнік, ..., ... . *(Адназначныя словы.)*

Іголка, марка, маска, зорка, пад'езд, карта, ..., ... . *(Мнагазначныя словы.)*

*Словы для даведкі:* дзяўчынка, карціна, хлопчык, нос.

Да якога слоўніка трэба звярнуцца пры ўзнікненні цяжкасцей падчас выканання задання? Абвядзіце літару з правільным адказам.

а) Да тлумачальнага;
б) да арфаграфічнага.

### Практыкаванне, накіраванае на авалоданне ўменнямі прымаць і захоўваць мэты і задачы вучэбнай дзейнасці

Прачытайце прыказкі. Пазнаёмцеся са словамі для даведкі. Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго.

**Ранняя** птушка крылкі цярэбіць, а ________ вочкі трэ.

У **добрую** часіну сказаць, а ў ________ памаўчаць.

З **вялікага** грому ________ дождж бывае.

*Словы для даведкі:* позняя, малы, ліхую.

## СКЛАД СЛОВА

### Практыкаванні, накіраваныя на авалоданне лагічнымі дзеяннямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі

**1.** Знайдзіце ў кожным радку слоў "лішняе" і закрэсліце яго. Назавіце прымету, якая аб'ядноўвае астатнія словы.

а) Бяроза, бярозавік, бяру, бярозавы.
б) Лес, лясны, леснічоўка, лесвіца.
в) Матыль, матылёк, матаць, матыльковы.
г) Ноч, начны, начаваць, начальнік.

Абазначце частку, якая аб'ядноўвае словы кожнага радка.

**2.** Вызначце, што аб'ядноўвае словы ў кожным радку. Дапоўніце кожны радок патрэбнымі словамі. Карыстайцеся даведкай.

а) Вада, зямля, лес, ____________, ____________.
б) Горка, ляснік, снежны, ____________, ____________.
в) Падсвечнік, падножка, падводны, ____________, ____________.

*Словы для даведкі:* печка, падветраны, поле, салодкі, падвеска, луг.

**3.** Размяркуйце словы на дзве групы. Укажыце прыметы, па якіх словы былі аб'яднаны ў групы.

Адбегчы, адважны, адвар, адводзіць, адвінціць, адзін, адмірал, адносны, адсталы, адстукваць.

________________ ________________
________________ ________________

з ________ без ________

### Практыкаванне, накіраванае на авалоданне ўменнямі прымаць і захоўваць мэты і задачы вучэбнай дзейнасці

Здагадайцеся, якое заданне трэба сфармуляваць да практыкавання. Выканайце гэтае заданне.

**Кітайскі шоўк**

Нацыянальная (Кітай) ________ вопратка шыецца з (шоўк) ________ тканіны. Гісторыя (Кітай) ________ шоўку налічвае пяць тысяч гадоў. Старажытныя (Кітай) ________ навучыліся выкарыстоўваць прыродныя магчымасці незвычайнага насякомага. Гэта насякомае — тутавы шаўкапрад. З яго коканаў атрымліваюць валакно, вырабляюць (шоўк) ________ тканіну.

У старажытнасці гэта трымалася ў сакрэце. (Кітай) ________ шоўк гладкі, атласны. (Кітай) ________ дзяўчат вучылі вышываць па шоўку. Яны рабілі ўзоры (шоўк) ________ ніткамі на веерах, карцінах. Вырабы з шоўку насілі імператар і вядомыя людзі.

*Па матэрыялах часопіса "Вясёлка"*
(2011. — № 1. — С. 24).

## ЧАСЦІНЫ МОВЫ

### Практыкаванні, накіраваныя на авалоданне лагічнымі дзеяннямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі

**1.** Знайдзіце ў кожным радку лішняе слова і закрэсліце яго. Пазначце прымету, якая аб'ядноўвае астатнія словы.

а) Птушка, песня, радасць, конь, печ — ________________.

б) Акуляры, дзверы, барацьба, штаны, канікулы — ________________.

в) Вясёлы, добрае, сонечны, дзянёк, прыгожая — ________________.

г) Бяжыць, слухаў, думае, глядзіць, смяецца — ________________.

**2.** Што аб'ядноўвае словы ў кожным радку? Абазначце частку, якая аб'ядноўвае словы кожнага радка.

Сіні, сінь, сінець.
Падабрэць, добры, дабрыня.
Белізна, белы, пабяліць.

Падзяліце словы на тры групы па іншай прымеце. Запішыце іх у тры слупкі. Пазначце прымету, якая аб'ядноўвае словы кожнага слупка.

| | | |
|---|---|---|
| ____________ | ____________ | ____________ |
| ____________ | ____________ | ____________ |
| [ ] | [ ] | [ ] |

**3.** Прачытайце спалучэнні слоў. Закрэсліце тыя з іх, якія напісаны па-руску.

| | |
|---|---|
| залаты медаль | золотая медаль |
| белая гусь | белый гусь |
| зелёный салат | зялёная салата |
| широкая степь | шырокі стэп |
| доўгі цень | длинная тень |

Запішыце, якой прыметай адрозніваюцца беларускія назоўнікі ад адпаведных рускіх.

________________________

Вызначце род беларускіх назоўнікаў. Запішыце, словы якой часціны мовы дапамаглі гэта зрабіць.

________________________

### Практыкаванне, накіраванае на авалоданне ўменнямі выконваць заданні творчага і пошукавага характару

Укажыце зверху, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы.

а) Бабуля **стала** каля пліты і пачала пячы бліны. Кошка ціха падышла да **стала**.

б) Снежань, студзень, **люты** — зімовыя месяцы. Трэба дапамагаць птушкам і жывёлам у **люты** мароз.

*ЛІТАРАТУРА*


Вясёлка : дзіцячы літ.-маст. часоп. — 2011. — № 1.

Вясёлка : дзіцячы літ.-маст. часоп. — 2015. — № 5.

Галубовіч, Я. Дзівосы роднай прыроды : апав. і казкі для дзяцей / Я. Галубовіч. — Мінск : Пачатк. шк., 2012. — С. 50.

Мацвеенка, У. І. Займальны родны алфавіт : вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту / У. Мацвеенка. — Мінск : Маст. літ., 2013. — С. 32.

Пазнякоў, М. П. У родным краі : для дзяцей мал. шк. узросту / М. Пазнякоў. — Мінск : Лит. и Искусство, 2009. — С. 77—78.

Шах, С. М. Вучым гаварыць і думаць : вучэб.-метад. дапам. для лагапедаў. — Мінск : Нар. асвета, 1998. — 95 с.

http://help-me.by/nastolnye-lampy-dlya-stola-sovety

http://uralhunter.com/uralhuntercompics/004006.jpg

http://prastora.by/sites/default/files/imagecache/80width/pastouka_z_dniom_naradzhennia_z_tortam.jpg

http://knihi.by/sites/default/files/imagecache/80width/pastouka-viasiolych-kaladau-VOKL.png

http://sendme.by/be/anna-silivonchik/happy-birthday-jam/

http://detl-i-vnuki.ru/skazka-o-malenkom-dozhdike-i-malchike-ii-nedelya-foto-marafona-moya-osen/

http://www.liveinternet.ru/community/4012277/post223191779/

http://www.balleto.gr/assets/media/PICTURES/Anekdota/108313.jpg

http://segalega.ucoz.ru/news/eda_kulinarnye_kartinki_risunki_detskie_kartinki_vesjoiaja_eda/2012-09-24-290



**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства
факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка.




*На дыску — дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы па тэмах "Тэкст", "Сказ", "Значэнне слова", "Склад слова", "Часціны мовы".*